Храм получил оригинальную объёмно-пространственную композицию – вдоль удлиненной планировочной оси расположены: низкий прямоугольный притвор под2-х склонной крышей, более высокий бабинец, над которым надстроена 1-ярусначетвериковая колокольня с маковкой, прямоугольный





молитвенный зал под 2-хсклонной крышей, прямоугольная апсида, над которой построен 8-гранный шатровый барабан с луковичноподобным куполом. Стены прорезаны квадратными, прямоугольными и горизонтально вытянутыми оконными проёмами. В церкви находятся иконы «Матери Божьей Смоленской» и «Апостолы Петр и Павел».

Церковь Святой великомученицы Параскевы Пятницы действовала и в годы Великой Отечественной войны. После войны закрыта, в ней размещалась тюрьма и столовая. Сейчас храм закрыт на реставрацию, служба проходит только раз в год 10 ноября, в день Параскевы Пятницы.

## Старая базарная площадь

Мы идем дальше по улице Буденного на старую базарную площадь. С 1940-х и до конца 1980-х гг. городской базар находился перед зданием универмага, пока не был перенесен на современное место.

На базарной площади размещались два крытых торговых ряда, на месте универмага – несколько ларьков с товарами ширпотреба.







На том месте, где сейчас стоит новый православный храм Рождества Христова и современная аптека, располагались площадки с коновязью.

Сюда приезжали жители окрестных деревень на телегах с лошадьми, здесь же и велась торговля. Именно эта торговая площадь запечатлена на старых фотографиях.

## Немецкие дома

По улице Донукалова мы идем в сторону Пятачка, так еще называют площадь Свободы. Улица Донукалова – до революции это улица Дворянская, после революции улица Пролетарская. После Великой Отечественной Войны улица была разделена и в таком виде существует и сегодня, до Пятачка – улица Донукалова, за Пятачком – улица Карла Маркса.

Среди зданий в центре города выделяются жилые дома послевоенной постройки, которые в народе называют «Немецкими домами».

Из воспоминаний жителей послевоенного города следует, что много пленных немцев работало на жилищном строительстве. Характерные черты этих

домов: 2 этажа, лепные или штукатурные украшения на углах и над окнами, острые, похожие на шпили фронтоны.



## Преображенская площадь

И вот мы выходим на Преображенскую площадь, название свое она получила от собора Преображения Господня, который находился здесь до Великой Отечественной войны и был разрушен. Сохранился он тоже только на старых фотографиях.

Много изменилось с тех пор, изменилось и название площади, сегодня это площадь Свободы.







## Дом присутственных мест

Самое старое здание, сохранившееся на сегодняшний день в Лепеле, находится на площади Свободы - дом присутственных мест, или здание уездной и городской администрации. Здание заложено в 1803 г., открыто и освящено в 1806 г.





## Тюрьма

Интересен тот факт, что нынешний магазин телефонов сети Life, не что иное, как городская (или уездная) тюрьма. С самого начала это здание строилось как тюрьма, таковым и оставалось до конца 1950-х гг.





## Почтовое отделение

Здание по адресу пл.Свободы, д.13 было построено в 1902 г. С момента постройки и до нашего времени (даже во время Великой Отечественной войны) в нем располагается почтовое отделение.



## Улица Ленинская

Дальше идем по улице Пушкинской, сейчас улица Ленинская, движемся обратно в городской парк. Справа – здание Районного исполнительного комитета, до революции здесь была гостиница.





## Типография

Слева магазин продуктов, где до революции была типография, в которой издавалась газета «Лепельский вестник» и журнал «Вести Лепельскаго товарищества сельскаго хозяйства».





## Здание районной газеты



Интересна и необычна история здания районной газеты.

Построено оно было в 1915 г. двумя мещанами Эдуардом Павловичем Филяндмужем и Мовшей Шендеровичем Кабалкиным. Второй этаж был жилой, а первый предназначался для производства и торговли. Филяндмуж занимался выпечкой и продажей хлеба, а Кабалкин – продажей галантерейных товаров.

В 1930-е гг. дом конфисковали. Сведения о семье Кабалкиных утеряны, а Филяндмуж прошел сталинские лагеря, после этого жил вРоссии. Как рассказал мне Матырко Василий Александрович, местный краевед и собственный корреспондент газеты «Лепельский край», редакция газеты поддерживает связь с его внуками.

## Цмок Лепельский

Заканчиваем экскурсию у нашего Лепельского Цмока.





Он поселился на берегу Лепельского озера в сентябре 2013 года. Он не летает, огонь не выдыхает и никого не обижает. Скульптура мифического змееподобного существа появилась здесь благодаря местным краеведам, решившего таким образом увековечить бренд края – Цмока Лепельского, персонажа из мифологии Великого княжества Литовского. Считать именно Лепель родиной Цмока стали благодаря историческому роману Владимира Короткевича «Хрыстос прызямліўся ў Гародні (Евангелле ад Іуды)», где подробно описывается внешний вид чудища и рассказывается, как в средневековье в Лепельском озере за одну ночь погибли около 40 цмоков. Именно отливка этой книги располагается сегодня у ног Лепельского Цмока.

# ПАЗНАВАЎЧЫ МАРШРУТ “ПАДАРОЖЖА З КНІГАЙ ПА ПОЛАЦКУ”

*Творчая група ДУА”Полацкая дзяржаўная гімназія №2“,*
*Кіраўнікі: Катовіч Маргарыта Уладзіміраўна,*
*Лапарэвіч Жана Фёдараўна*

***З Полацка пачаўся свет***

*Р. Барадулін*

***Нам кніга-вечнае святло,***
***Крыніца ведаў, цуд бясконцы!***
***І параўнацца з ёй магло б,***
***Відаць, у свеце толькі сонца.***

*М. Пазнякоў*

*“Ад Полацка пачаўся свет…”, але перш свет нарадзіўся разам з ім- таксама , як пачынаецца новы свет з першым крыкам кожнага немаўляці.*

*Старажытная полацкая зямля, багатае гістарычнае мінулае якой звязана са станаўленнем беларускай дзяржавы, праваслаўя, адукацыі і культуры... Багатая гісторыя Полацка, не можа не вызываць цікавасці і павагі. Гісторыя горада стваралі выдатныя асобы-гонар усёй нашай краіны: святая заступніца зямлі беларускай прападобная Еўфрасіння Полацкая, першадрукар Францыск Скарына, асветнік і публіцыст Сімяон Полацкі, заснавальнік беларускай класічнай літаратуры XIX стагоддзя Ян Баршчэўскі, беларускія жывапісцы В.Ванькові і І.Хруцкі, кінарэжысёр Ю.Тарыч і многія іншыя вядомыя ўсяму свету людзі, якія з’яўляюцца прыкладам адданасці Радзіме і служэння свайму народу. Палітычная і эканамічная веліч Полацка падтрымлівалася за кошт багатага культурнага жыцця. Ён вядомы сваімі кніжнымі традыцыямі яшчэ з 11 стагоддзя.*

*Гісторыя Полацка шматпакутная, у ёй адзначаны і перамогі, і перыяды цяжкіх выпрабаванняў. Колькі разоў бушавалі на полацкай зямлі спусташальныя войны, колькі разоў ліхалецці замахваліся на гонар і волю- столькі разоў дзеці горада аднаўлялі і ўслаўлялі яго. І ішлі далёка ў свет са святлом веры, са словам ведаў, з радасцю і натхненнем. І цяпер іхні агонь - у нашых далонях. І імя яму - Памяць..*

*Сённяшні Полацк працягвае выконваць вялікую місію. Ён дынамічна развіваецца. Нам ёсць кім і чым ганарыцца. Полацк упэўнена глядзіць наперад, у будучыню. Горад – сталы і мудры- стаіць на беразе Ракі Часу. Слава яго- непахісная, гонар яго – неаспрэчны. Ён сам цэлы сусвет. Ад яго пачаўся свет для кожнага, хто нарадзіўся на гэтай святой зямлі. Ім узбагаціўся свет кожнага, хто прыйшоў і дакрануўся.*

*Адсюль, з блаславёнай зямлі, з высокага дзвінскага берага, дзе стромкім ветразем узносіцца ў неба Сафія, адпраўляліся ў падарожжа лёсу слынныя палачане.*

***Тут пачынаецца і наш шлях-падарожжа па незвычайнай і пазнавальнай карце горада, якая складаецца з мясцін, назваў вуліц, гарадскіх будынкаў, помнікаў, звязанных адным словам- КНІГА.***

***КНІГА.*** *Бясцэнны скарб, крыніца ведаў, мудрасці і духоўнасці. Так было стагоддзі таму, так застаецца сёння. На двары імклівае XXI стагоддзе, час касмічных хуткасцяў і высокіх тэхналогій.. Здавалася б, друкаванае слова засталося ў мінулым, але… Першы крок да спасціжэння ведаў, як і стагоддзі таму, дзіця робіць, разгортваючы буквар…*

*Полацк-горад кніжнай асветы. І сёння мы, гартаючы кніжныя старонкі, шукаем ісціны жыцця, пазнаём глыбіню сусвету.*

# Падарожжа ПЕРШАЕ

## "Ад Ізяслава-кніжніка да сучаснага кнігадрукавання”

| | |
|---|---|
| ***Мэта экскурсіі:*** | • Духоўнае і патрыятычнае выхаванне на прыкладзе дзейнасці знакамітых асветнікаў Полацка. |
| ***Задачы экскурсіі:*** | • 1.Паказаць значэнне горада Полацка ў духоўным і культурным развіцці Беларусі са старажытных часоў да нашага часу.<br>• 2. Пазнаёміць з вытокамі беларускага кнігадрукавання, з дзейнасцю знакамітых асветнікаў. |
| ***Месца сустрэчы з групай:*** | • вул. Замкавая.1<br>• (Сафійскі сабор) |
| ***Працягласць экскурсіі:*** | • 150 хвілін. |
| ***Адлегласць маршрута:*** | • 3 км |
| ***Склад экскурсантаў:*** | • дарослыя, вучні |
| ***Від экскурсіі:*** | • пешаходная, аўтобусная |









# Маршрут экскурсіі

| | |
|---|---|
| **СТАРТ** вул.Замкавая,1 | • 1. САФІЙСКІ САБОР |
| вул. Ніжне-Пакроўская, 22 | • 2.МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ |
| вул.Е.Полацкай | • 3.ПОМНІК Е.ПОЛАЦКАЙ |
| праспект Ф.Скарыны | • 4.ПАМЯТНЫ ЗНАК ЛІТАРЫ “Ў” |
| праспект Ф.Скарыны | • 5.ПОМНІК СІМЯОНУ ПОЛАЦКАМУ |
| праспект Ф.Скарыны | • 6.ПОМНІК ФРАНЦЫСКУ СКАРЫНУ |
| вул.Юрыя Гагарына,8 | • 7.Рэспубліканскае ўнітарнае паліграфічнае прадпрыемства “СПАДЧЫНА Ф.СКАРЫНЫ” |
| | • 8.ПЛОШЧА Ф.СКАРЫНЫ |

*Тэхналагічная карта экскурсійнага маршруту*
*"Ад Ізяслава- кніжніка да сучаснага кнігадрукавання”*

# Маршрут экскурсіі. Падарожжа ПЕРШАЕ



1 Сафійскі сабор
2 Музей беларускага кнігадрукавання
3 Помнік Еўфрасінні Полацкай
4 Помнік літары "Ў»
5 Помнік Сімяону Полацкаму
6 Помнік Францішку Скарыну
7 Друкарня "Спадчына Ф.Скарыны»
8 Плошча Ф.Скарыны

# Ад Ізяслава-кніжніка да сучаснага кнігадрукавання

**Мы жывём на слыннай зямлі, у гістарычным і духоўным сэрцы краіны. Мы – нашчадкі бясцэннай спадчыны, пакінутай нам славутымі продкамі.На старонках кніг вучоныя, пісьменнікі, філосафы імкнуліся зафіксаваць свае, цяжкаю працаю здабытыя веды, свой вопыт, свае думкі і такім чынам захаваць іх для нас . Дзе вытокі гэтай спадчыны? Што стала перадумовай для стварэння першай беларускай кнігі?**

**Князь Ізяслаў** (?-1001), сын князёўны Рагнеды, першы з усходнеславянскіх князёў якога летапісцы называюць “кніжнікам”. Менавіта ён распаліў светач асветы, увёў пісьменства і навучанне грамаце, пачаў збіраць рукапісныя кнігі, якія склалі першую з вядомых у Беларусі бібліятэку, якая потым існавала ў Сафійскім саборы, узведзеным у час княжання Усяслава Брачыслававіча. У яе скрыпторыі пад мігценне свечкі руплівa перапісвала кнігі прападобная Еўфрасіння…



Князь Ізяслаў



САФІЙСКІ САБОР

*Вул. Замкавая, 1*



*Саборы г.Полацка*

Князёўна Прадслава – **прападобная Еўфрасіння Полацкая** ((каля1101-1005)-1167), унучка славутага полацкага князя Усяслава Чарадзея. Без гэтага імя немагчыма ўявіць не толькі духоўнае жыццё на ўсходнеславянскіх землях у XI стагоддзі, але і ўсю шматвекавую гісторыю Беларусі. Яна выбірае не лёс князёўны, а лёс манахіні, асветніцы і кніжніцы, лёс ігуменні Полацкай абіцелі.І на гэтым шляху яна дасягае святасці. Спачатку Еўфрасіння перапісвала і перакладала кнігі ў Сафійскім саборы.. А калі бацька пабудаваў для яе манастыр, перайшла ў яго: з цягам часу там пачалі працаваць майстэрні па перапісванні кніг.



Прападобная Еўфрасіння Полацкая



Помнік Еўфрасінні Полацкай

***Скрыжаванні вуліц Камуністычнай і вуліцы Е. Полацкай.***
*Устаноўлены ў 2000 г. Аўтар, член Саюза мастакоў І. Голубеў.*

## Іменем Еўфрасінні Полацкай у г.Полацку названы:



***СПАСА – ЕФРАСІННЕЎСКІ МАНАСТЫР***
***Вул.Е Полацкай,89***



***ВУЛІЦА ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ***
***Вул.Е Полацкай***



***УА "ПОЛАЦКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА №18 ІМЯ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ"***
***Вул.Хруцкага,24***

Славуты палачанін **Францыск Скарына** (да1490- каля 1551), беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, які пакінуў нашчадкам перакладзеныя на блізкую да народнай мовы кнігі Бібліі. Ён імкнуўся, каб яго земляки чыталі, вучыліся, каб гучала роднае слова ў святых тэкстах, якое, як і жыццё, дадзена Богам кожнаму народу. *“…Любіце кнігу, бо яна - крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы…”.* Гэтыя словы звернуты да ўсіх. І ягоны запавет - на ўсе вякі: покуль будзе планета Зямля кружыць у нябесных прасцягах.



Францыск Скарына



Помнік Францыску Скарыну

***Праспект Ф.Скарыны.***

*Устаноўлены ў 1974г.*
*Скульптары: А.Глебаў, І.Глебаў, А.Заспіцкі*
*Архітэктар В. Марокін*

## Іменем Ф. Скарыны ў г.Полацку названы:



***Праспект імя Ф.Скарыны***



***вуліца імя Ф.Скарыны***



***плошча імя Ф.Скарыны***



***УА “ПОЛАЦКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ГІМНАЗІЯ №1 ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ”***
***Вул. Камуністычная,13***



***ГУК “ПОЛАЦКАЯ РАЁННАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ”***
***Вул. Гогаля,15***



***Полацкае рэспубліканскае ўнітарнае паліграфічнае прадпрыемства “СПАДЧЫНА Ф.СКАРЫНЫ”***
***Вул. Ю.Гагарына,8***



**Сімяон Полацкі** (1629-1680) (Пятроўскі-Сітніяновіч Самуіл Гаўрылавіч), першы прафесійны паэт і драматург, пісьменнік, філосаф, перакладчык, педагог, царкоўны і грамадскі дзеяч. Нарадзіўся ў Полацку. Пачынаў шлях у навуку ў родным горадзе. Стаў праваслаўным манахам і настаўнічаў у брацкай школе пры Богаяўленскім манастыры. Вакол манастыра згуртаваліся паэты і пісьменнікі. Гэта была першая школа беларускіх літаратараў. Арганізаваў у Маскве першую свецкую друкарню, якая атрымала права выдаваць кнігі без спецыяльнага дазволу патрыярха. У кнігах у С. Полацкага багацце думак, непаўторнасць вобразаў, трапнасцьназіранняў за жыццём. *“Тако читаяй книги божественны аки по нужде будет умудренны”.* Дзякуючы свайму таленту і справам, С.Полацкі годна ўвайшоў у літаратуру і гісторыю беларускага і рускага народаў.



Помнік Сімяону

***Праспект Ф. Скарыны.***
*Скульптар А. Фінскі*

Помнікі г.Полацка

## Іменем Сімяона Полацкага ў г.Полацку названы:



***ШКОЛА – ТЭАТР СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА (ГПК)***
***Вул.Гогаля,15***



***МУЗЕЙ–БІБЛІЯТЭКА ІМЯ СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА***
***Вул. Ніжне–Пакроўская, 22***

Адзіным у Беларусі з'яўляецца, адчынены ў 1990 г. у будынку былой Брацкай школы Богаяўленскага манастыра **Музей беларускага кнігадрукавання**. 15 залаў падрабязна знаёмяць з гісторыяй пісьменства, кніжнай ілюстрацыі, паліграфіі. У экспазіцыі прадстаўлены рукапісныя выданні, арыгіналы рарытэтных старадрукаў: "Евангелле вучыцельнае" 1595г., "12 прамоў" Іераніма Фалецкага 1558г. Самая тоўстая кніга"Вока Царкоўнае" 1641г. мае 1185 аркушаў. Самая вялікая па памеры – "Каранацыйны зборнік Аляксандра ІІ" У вышыню дасягае метр, яе вага - 26 кілаграмаў. Ёсць калекцыя кніжак-мініяцюр памерам не больш за карабок запалак. Тут захоўваецца самая поўная і вялікая калекцыя кніг-лаўрэатаў Нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі", які праводзіцца з 1960г. Штогод праводзіцца выстава выданняў-лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу "Лепшыя кнігі Беларусі".



Музей беларускага кнігадрукавання

*Вуліца Ю.Гагарына, 8*




Рэспубліканскае унітарнае паліграфічнае прадпрыемства

***Жаданне вучыцца, удасканальвацца і адкрываць новыя магчымасці-і ёсць тое галоўнае, што яднае, полацкіх паліграфістаў з беларускім першадрукаром.***

*Дырэктар Полацкага РУПП "Спадчына Ф . Скарыны" М.Ільюшонак*

На радзіме беларускага першадрукара сёння плённа працуюць яго нашчадкі. У 1918 г. на базе прыватнай была створана гарадская друкарня, якая паклала пачатак нараджэнню паліграфіі на Полаччыне. Пасля Вялікай Айчыннай вайны друкарня размяшчалася на вул. Войкава, у 1948г. пераехала на вул. Сака і Ванцэці, дзе знаходзілася да 1990г. У 1992г. створана паліграфічнае прадпрыемства "Спадчына Ф. Скарыны". Прадпрыемства спецыялізуецца на выпуску дапаможнікаў, сшыткаў, паштовак, плакатаў, кніг.





Знак літары “Ў”

***Праспект Ф.Скарыны***

*Аўтар знака - полацкі мастак Ігар Куржалаў.*

Памятны знак літары **“Ў” (“У” кароткай)** у беларускім алфавіце ўстаноўлены ў скверы ў 2003 годзе, падчас 10-х юбілейных святкаванняў Дня беларускага пісьменства.

***Музеі г.Полацка***

# ПАЗНАВАЎЧЫ МАРШРУТ “КРАЙ ЦУДАЎ, ГЕРОЯЎ І ЛЕГЕНД”

*Шыбека Мікіта, Іванова Алена, Зіміна Дарья,*
*навучэнцы аб’яднання па інтарэсах “Юныя краязнаўцы”*
*ДУДА “Цэнтр дзяцей і моладзі Віцебскага раёна”*
*Кіраўнікі: Нікіціна Людміла Канстанцінаўна, Нікіцін Станіслаў Пятровіч*

Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць… Вельмі дакладна вызначыў Алесь Ставер патрыятычнае адчуванне кожнага з нас, хто любіць свой край, сваю Радзіму. Мы шмат падарожнічаем па Беларусі. Захапляемся, здзіўляемся. Але найбольшае адчуванне замілавання перажываеш дома. Асабліва, калі распавядаеш пад час экскурсіі пра свае мясціны гасцям. Запрашаем у падарожжа па Віцебскаму раёну.

## ВІЦЕБСКІ РАЁН - ГЭТА

2,8 тыс. кв. км;
Больш за 38 тыс. жыхароў;
буйныя чыгуначныя і аўтамабільныя магістралі;
багатае гістарычнае мінулае;
культурная і гістарычная спадчына;
заказнікі, зоны адпачынку і помнікі прыроды;
каля 60 маляўнічых азёр;
найбуйнейшае радовішча даламіту, якому 300 млн. гадоў;
знакамітыя людзі зямлі беларускай.



*Флаг і герб Віцебскага раёна.*

## Маршрут экскурсіі:

*г. Віцебск – Ціраспаль – в. Суйкава – Пуцявішча – в. Субачы, Святое возера – аг. Заронава – Веліканаў Хутар – в. Старое Сяло – в. Малыя Лётцы – Вялікія Лётцы – мемарыял «5-ы полк» – г.Віцебск.*

## Кароткае апісанне маршрута

Пачынаецца са старажытнай часткі г. Віцебска «Церасполле». Першы прыпынак у беларускай Швейцарыі побач з в. Суйкава, на беразе Іскраўскага возера. Тут можна падняцца на гару, з якой адкрываюцца маляўнічыя пейзажы. Наступнае наведванне – в. Пуцявішча, якая згадваецца ў паэме «Тарас на Парнасе» К. Вераніцына. Затым прыпынак каля Святога возера з падарожжам да Святой крыніцы.

У в. Заронава наведванне музейнага комплексу, абед з рускай печы, наведванне Заронаўскага некропаля, дзе “растуць” крыжы. Ддалей наш маршрут ляжыць на Веліканаў хутар побач з в. Касцюкі, гэтыя мясціны звязаны з самым высокім чалавекам у свеце - Фёдарам Махновым. У в. Старое Сяло – гісторыка-краязнаўчы музей сярэдняй школы. У в. М. Лётцы – вядомы санаторый-прафілакторый, зімовы сад, крыніца з мінеральнай вадой. Па дарозе яшчэ будуць Вялікія Лётцы, дзе пройдземся па брукаванцы і ўбачым былы дом батаніка У.Адамава. Завяршаецца наш маршрут наведваннем мемарыяла «5-ы полк» на вуліцы Цітова ў г.Віцебску.

Прапануецца маршрут па Віцебскай раёну, які даступны велатурыстам або на транспарце і дазваляе больш глыбока пазнаёміцца з гістарычнымі славутасцямі роднага краю, адпачыць на ўлонні прыроды.

Кіламетраж і прыродныя ўмовы дазваляюць здзейсніць 1-2-дзённыя вандроўкі і паходы. Гэта цікавая турысцкая сцяжынка ў Віцебскай вобласці.



*Велападарожжа працягнецца 8-10 гадзін, калі з начоўкай–2 дні.*
*Пешае падарожжа–2 дні.*
*Аўтападарожжа–5-7 гадзін.*
*Папярэдняя дамоўленасць аб экскурсіі (пры неабходнасці – заказ абеду) з кіраўніком маршрута Л.К.Нікіцінай:*
*+37529-2474671-МТС*
*+37529-6789590-А1.*

## Пункт 1. Ціраспаль

Пачынаем з сучаснага мікрараёна Віцебска – Ціраспаль. Гэта назва па адной з версій мае наступнае значэнне: «Цярэспаль», г.зн. паселішча, размешчанае за полем.

У час Вялікай Айчыннай вайны тут вяліся жорсткія баі і пры абароне, і вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Менавіта тут першымі прарваліся савецкія воіны пры вызваленні горада.



## Пункт 2. "Швейцарыя"

На маляўнічым Іскраўскім (мяркую, што раней называлася Швейцарскае) возеры размясцілася на высокім беразе беларуская Швейцарыя. Тут да вайны была вёска з такой назвай. А пазней стала Іскра.

Калі падняцца на мясцовую гару, то ва ўсёй красе адкрываюцца маляўнічыя пейзажы беларускай глыбінкі.

Гару акаляюць тры вадаёмы. І, вядома ж, лебедзі, якія жывуць на гэтым возеры. Па легендзе Іскраўскае возера мае падземны ход, які злучае яго з панскім возерам.



## Пункт 3. Пуцявішча

Менавіта гэта «Пуцявішча» згадваецца ў паэме К. Вераніцына «Тарас на Парнасе». Яшчэ ў 1906 годзе тут было 4 дамы і жыло 35 чалавек. Зараз вёска ўжо не існуе, захавалася толькі назва гэтага месца. Мясцовасць адрозніваецца цікавым рэльефам – аполкамі, як кажуць мясцовыя жыхары.

*Ці знаў хто з вас, браткі, Тараса,*
*Што палясоўшчыкам служыў?*
*На Пуцявішчы, у Панаса,*
*Я там ля лазні блізка жыў.*
*Што ж, чалавек я быў рахманы,*
*Гарэлкі ў губы я ня браў,*
*Затое ў ласцы быў у пана -*
*Мяне пан дужа шанаваў.*
*Любіла то ж мяне і паня,*
*І войт ні разу не збрахаў,*
*Затое ёя балота зрання*
*Да цёмнай ночы пільнаваў...*

### Пункт 4. Святое возера

Назва в. Субачы ад рускага слова «Субочь», што азначае «каля дарогі». Вёска ўпершыню згадваецца ў крыніцах у канцы 16 стагоддзя. У 1908 годзе праславілася тым, што тут быў знойдзены манетны скарб, які схаваны быў яшчэ ў 17 стагоддзі. Восемдзясят дзве сярэбраныя манеты Рэчы Паспалітай і Шведскай Прыбалтыкі.

Недалёка ад вёскі знаходзіцца *Святое возера*, якое вядома легендай аб царкве, якая праваліласяа. Тут жа і Святая крыніца, да якой ўжо даўно пратапталі сцежку многія віцябляне *(прапануем і вам пакаштаваць вадзіцы са святой крыніцы)*.



Непадалёку - *Каравайское возера* (па форме нагадвае каравай), возера Княжно , таксама са сваёй легендай пра Княжну, якая ўтапілася ў возеры.

### Пункт 5. Заронава

Заронаўская зямля ўпершыню згадваецца ў літоўскіх метрыках у 1533 годзе. Назва вёскі паходзіць ад Асарон, што значыць возера. Заронава было цэнтрам “уездного благочиния”. Драўляная царква святога Ануфрыя пабудавана ў 1711 годзе. А ў другой палове 19 стагоддзя з цэглы пабудавалі. І была яна падобна на карабель.

У 1863 г. тут было адкрыта валасное народнае вучылішча, а ў 1905 тут была школа граматы і народнае вучылішча. Землеўладальнікам заронаўскіх зямель быў граф Забэла. Як успаміналі мясцовыя людзі: быў добрым, клапаціўся аб адукацыі і медыцынскім абслугоўванні.

У час Вялікай Айчыннай вайны Заронава было акупавана з ліпеня 1941 г. па чэрвень 1944 гг. Былі знішчаныя ўсе 29 двароў і 7 мірных жыхароў. У баях за вызваленне вёскі загінулі 4377 воінаў 43-й арміі і партызан. Пасля вайны в. Заронава была адноўлена.

У 1980 г. на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан быў пастаўлены помнік – 3 пілоны з барэльефамі танкіста, пяхотніка і лётчыка, на мемарыяльных дошках ўвекавечаны прозвішчы загінуўшых. У 2015 годзе на заронаўскім мемарыяле адкрыта мемарыяльная пліта з прозвішчамі 99 лётчыкаў 3 Паветранай Арміі, што загінулі на тэрыторыі Віцебскага раёна



Заронава размешчана на беразе возера, якому ўжо больш за 10 тысяч гадоў. Тут мы вам прапануем адпачынак на Заронаўскай возеры, падчас адпачынку пачуеце легенды пра Казінчык (сом з’еў казу, калі тая зайшла папіць вады ў возера) і Напалеонаўскі усух.(быццам напалеонаўскія салдаты насыпалі пераправу цераз возера). На возеры лебедзі жывуць круглы год.

Прапануем наведаць Шчацінку, дзе ўбачыце *каменныя крыжы і іншыя помнікі 19 - пач. 20 стагоддзя.*



## Пункт 6. Музей “Гісторыя Заронаўскага краю”

Асаблівай увагі на нашым маршруце заслугоўвае гісторыка-этнаграфічны музей “Гісторыя Заронаўскай краю”. Музей быў адкрыты 9 мая 1986 года, а ў 1996 - яму было прысвоена званне "народны". З адкрыцця музея і па цяперашні час яго кіраўнікам з'яўляецца Людміла Канстанцінаўна Нікіціна. Сёння можна ўжо казаць пра музейны комплекс, бо музей мае 8 выставачных залаў, экспазіцыю пад адкрытым небам і больш за 27000 экспанатаў.

## Пункт 7. «Волатаў хутар»

Нарадзіўся Фёдар Махноў у в. Касцюкі ў сялянскай сям'і ў 1878 годзе. З 12 гадоў хлопчык пачаў хутка расці, і ў 16 гадоў яго рост дасягаў 2 метры. Федзя з ранніх гадоў працаваў і дапамагаў бацькам.

Аднойчы на рынку яго заўважыў нямецкі ўладальнік цырка. Ён запрасіў хлопчыка да сябе працаваць. 9 гадоў Фёдар Махноў выступаў у цырках Германіі. У 25 гадоў рост яго складаў 285 см. Махноў вырашыў вярнуцца дадому і завесці сваю гаспадарку.



*Фёдар Махноў з жонкай Ефрасінняй*



*Рэшткі вадзянога млына каля Волатавага хутара*

У в. Касцюкі ён купіў сядзібу ў мясцовага пана і ажаніўся з настаўніцай вучылішча Ефрасінні Лебедзевай. У іх нарадзілася дачка Марыя і сын Мікалай, затым дачка Маша і два сыны - блізнюка: Раман (Радзімір) і Гаўрыла (Галюнь).

Гэта быў 1912 год. У гэты час у веліканa вельмі балелі ногі, якія ён застудзіў, працуючы ў пана на вадзяным млыне ў дзяцінстве. Але памёр ён ад хваробы лёгкіх. Пахаваны на могілках недалёка ад яго хутара.Даўжыня ступні ў

Фёдара Махнова была 51 см, далоні - 32 см, важыў - 186 кг.

## Пункт 8. Старое Сяло

Калі канкрэтна ўзнік панскі маёнтак у Старым Сяле, не высветлена, але вядома, што ў 1523 годзе яго купіў за 15 рублёў віцебскі ваявода маршалак Сапега Іван Багдановіч. Затым маёнтак часта пераходзіў да новых гаспадароў. Апошнім гаспадаром маёнтка быў славуты царскі генерал ад кавалерыі І.А.Андрыянаў. У панскім доме пасля рэвалюцыі размясцілася Старасельская школа.

У час вайны там быў нямецкі шпіталь, а падчас наступальнай аперацыі вясной 1944 будынак быў разбураны, а таксама ўсе 125 двароў. З садова-паркавага ансамбля маёнтка захавалася частка ліпавых алей, векавыя дубы, серабрыстая асіна, лістоўніца, піхта, закінутыя сажалкі.

У 2,5 км на поўдзень ад вёскі на мысе правага берага Заходняй Дзвіны знаходзіцца старажытнае гарадзішча. Яго плошча 30х70 м, вышыня над поймай 20 м. Гарадзішча адносіцца да днепра-дзвінскай культуры і ўзнікла ў 3–4 стагоддзі нашай эры. Ёсць таксама курганныя магільнікі (належаць крывічам), якія датуюцца 9–10 стст. Падчас раскопак знойдзены прадметы з косці, каменя, жалеза, керамікі.

## Пункт 9. Народны музей у Старым Сяле



Народны гісторыка-краязнаўчы музей у Старасельскі сярэдняй школе утвораны ў 1982 годзе. Музей – неад'емная частка гісторыі Старога Сяла. Кіруе музеем дасведчаны краязнаўца Віцебскага раёна – М.Д.Юшкевіч.

У музеі прадстаўлены экспазіцыі: старажытнае гарадзішча, маёнтак Стараселле, чыгунка, сярэднявечная сялянская хата, волат Фёдар Махноў, этнаграфія, Старасельская школа,гісторыя даваеннага перыяду, ваенная экспазіцыя.

У музеі Старасельскай школы М.Д. Юшкевіч вядзе навукова-даследчую і выдавецкую працу, актыўна папаўняе фонды музея новымі дакументамі, музейнымі прадметамі, выдае кнігі. Ужо выдадзена 15.

## Пункт 10. Малыя Лётцы

У XIX ст. маёнтак «Малыя Лётцы» належыў памешчыку Свянціцкаму. У 1866 г. праз яго валоданні прайшла чыгунка Віцебск–Дынабург, а прыпынак так і назвалі «Платформа Свянцінскага”.




*Санаторый «Лётцы»* – жамчужына Прыдзвіння. Гэта візітная картка нашага раёна. Сваю гісторыю гэта лячэбная ўстанова піша з 1936 года. Гэта быў дом адпачынку для работнікаў віцебскай фабрыкі. У гады вайны – нямецкі шпіталь, пазней – савецкі. У пасляваенны час тут лячыліся лёгачныя захворванні, з 1949 здабыла статус кардыялагічнай здраўніцы. З сярэдзіны 90-х гадоў з'явіліся новыя профілі.

На тэрыторыі санаторыя ёсць 4 мінеральных крыніцы. Побач ёсць санаторый-прафілакторый Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі, дзе турыстам можна наведаць зімовы сад, у якім растуць цікавыя расліны.

## Пункт 11. Вялікія Лётцы

Непадалёку віднеецца старажытная брукаванка, па якой сцвярджаюць месцічы, праязджала сама Кацярына II. А вузкая сцежка праз агароды выводзіць да старога будынку. Тут колісь і жыў чалавек, які пасадзіў гэты дуб – не зусім характэрную для віцебскага раёна расліну. Вядомы геабатанік, фларыст, дэндролаг Уладзімір Адамаў.

Выдатны даследчык флоры беларускага Палесся і Крыма жыў у Лётцах у радавым маёнтку на мяжы 19-20 стагоддзяў. Уладзімір Адамаў меў вякую навуковую зацікаўленасць мясцовым раслінным светам. Ён аўтар артыкулаў пра сады ў наваколлях Віцебска. А ў 1890 годзе Адамаў заснаваў у Лётцах батанічны сад. Парнікі, цяпліца, пітомнік з лекавымі раслінамі… Дрэвы і хмызнякі (больш за тысячу відаў!) з розных куточкаў свету прыжыліся на чужой глебе, як дома. У маёнтку мелася свая бібліятэка, батанічны музей, быў сабраны гербарый. Асабліва ганарыўся мясцовы навуковец калекцыяй



*Дуб на тэрыторыі былой сялібы У.Адамава*



розных сартоў бэзу, што цвіў у садзе напрацягу некалькіх месяцаў. Сад заняпаў, калі Уладзімір Адамаў пакінуў маёнтак. Але ж пабачыць значную частку гэтай прыгажосці сёння можна ў Віцебскім батанічным садзе. Перавезлі яе ў сярэдзіне 20-х гадоў мінулага стагоддзя.

Імя Уладзіміра Адамава ў Лётцах вядомае. Дагэтуль радуюць вока жыхароў пасёлка унікальныя расліны з ўжо стагадовай гісторыяй.

## Пункт 12. 5-ты Полк

Масавае знішчэнне савецкіх грамадзян і ваеннаслужачых Чырвонай арміі пачалося з моманту акупацыі Віцебска нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Для гэтага былі створаныя канцэнтрацыйныя лагеры.

У Віцебску на працягу 1941–1944 гг. дзейнічалі 5 буйных лагераў смерці (у тым ліку, 1 гета). Першы такі лагер быў створаны на тэрыторыі ваеннага гарадка 5-га чыгуначнага палка (зараз гэта вул. Цітова г.Віцебска). Ён размяшчаўся па два бакі рова, меў тры назіральныя вышкі з кулямётамі.

З 1941 г. да 1943 тут знаходзілася каля 100 000 чалавек. Амаль усе яны былі знішчаны. Шматлікія паказанні жыхароў в. Мішуткі і в. Мішкавічы пацвярджаюць гэтыя факты. Немцы прывозілі кожны дзень на машынах па 200 - 250 чалавек, ставілі на край ямы і расстрэльвалі з кулямётаў і аўтаматаў. З 1943 па люты 1944 года лагер выкарыстоўваўся як перасыльны пункт для грамадзянскага насельніцтва, якое вывозілася на працу ў Нямеччыну.

Усяго ў лагеры смерці «5-ы полк» загінула 80 - 100 тысяч  чалавек, у тым ліку і мірных жыхароў.

У 1964 г. на месцы лагера для ўшанавання памяці ахвяр фашызму пастаўлены помнік.



## Дадатковая інфармацыя, якая можа спатрэбіцца на маршруце

### Заронаўскі сельсавет працуе

панядзелак, серада, пятніца *з 8.00 да 17.00*
Аўторак, чацвер *з 8.00 да 18.00* (дзяжурны па графіку)
Абедзенны перапынак з *13.00 да 14.00*
1-я субота месяца з *9.00 да 13.00* (дзяжурны па графіку).

***Звяртаем увагу, што Заронаўскі сельсавет знаходзіцца ў в.Пестуніца на вул.Камуністычнай, д.5.***

Тэлефон: *8 0212 209045(57)*

**Магазіны** размешчаны ўздоўж трасы:

**в.Суйкава** – з аўторка па суботу *з 10.30 да 18.00 абед з 14.00 да 14.30.* Нядзеля з *10.30 да 15.00*. Панядзелак – выхадны . Тэлефон: *8 0212 69-67-11*

**в.Пестуніца** – кожны дзень з *9.00 да 20.00* без абеду і выхадных.

**аг.Заронава** – працуе кожны дзень без абеду і выхадных з 8.00 да 19.00. Тэлефон: *8 0212 206521*

**ФАПы**:

**в.Пестуніца** працуе з *8.00 да 12.00* з панядзелка па пятніцу. Вул. Камуністычная, 23. Тэлефон: *8 0212 209 034*

**аг.Заронава** працуе з *8.30 да 12.30* з панядзелка па пятніцу. Вул. Паркавая, 4. Тэлефон: *8 0212 206524*

### Аддзяленне сувязі

аг.Заронава: вул.Прыазёрная, 2, тэлефон: *8 0212 69-04-55*
Рэжым працы: аўторак-субота з *8.00 да 14.00* Выхадны: нядзеля, панядзелак.

**”Віцебшчына запрашае“**

Адукацыйныя маршруты Віцебскай вобласці

Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
”Віцебскі абласны палац дзяцей і моладзі“
Аддзел турызму і краязнаўства
Сектар патрыятычнай і краязнаўчай работы

Тэлефон/факс: 8 0212 68 30 09, 68 30 26
E-mail: kraeved.vitebsk@mail.ru
Сайт: https://centers.by/
https://vk.com/kraevedvitebsk